о Господе, возвеселится душа моя о Боге моем; ибо Он облек меня в **ризы спасения, одеждою правды одел меня, как на жениха возложил венец и, как невесту, украсил убранством**» [2, с. 725]. 39 «Подняв глаза свои, они увидели: вот восклицания и большое приданое; **навстречу вышел жених и друзья его и братья его с, тимпанами и музыкою и со многими оружиями**» [2, с. 919]. «Вечером молодые вводились в брачную опочивальню» [2, с. 483]. Пир продолжался неделю в память того, что Лаван некогда заставил Иакова работать в его доме семь лет за Лию и семь лет за Рахиль, [2, с. 31] или даже и две недели [2, с. 484].

Как видно из вышеизложенного, сама суть и структура чина Брака в Ветхом Завете очень схожа с современным чином, также имеется две стадии заключения брака: помолвка, с которой иногда связано и составление брачного договора, и свадьба с той лишь поправкой, что современный чин впитал в себя особенности, обусловленные приходом в мир Спасителя Иисуса Христа и наступлением эпохи Нового Завета.

**Литература**

1. (Дроздов) Митрополит Филарет. Пространный христианский катехизис Православной Кафолической Восточной Церкви. – М. : Директ-Медиа, 2014. – 133 с.

2. Библия. Священное Писание Ветхого и Нового Завета. – М. : Издание Московской Патриархии, 1992. – 1372 с.

3. Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. В 2 т. Т. 1: А-О. – М. : ОЛМА-ПРЕСС, 2002. – 1280 с.

4. Хулап, В., священник. Краткая история чинопоследования обручения и венчания / Азбука веры [Электронный ресурс] / Православная энциклопедия. – Режим доступа: http://azbyka.ru/kratkaya-istoriya-chinoposledovaniya-obrucheniya-i-venchaniya. – Дата доступа: 22.10.2018.

## Асаблівасці вырабаў урэцка-налібоцкіх шкляных мануфактур

*Макоўская Я. У., студ. IV к. БДУ,*
*навук. кір. Грыбко І. Л., ст. выкл.*

На тэрыторыі Беларусі ў XVIII–XIX стст. адбываецца актыўная вытворчасць шкла. Самыя вядомыя цэнтры вытворчасці размяшчаліся ў вёсках Налібокі [1, с. 274] і Урэчча [2, с. 590], дзе Радзівіламі былі заснаваны шкляныя мануфактуры. Шкло, вырабляемае на гэтых мануфактурах, мела шэраг асаблівасцяў, таму вылучалася ў асобную групу шкляных вырабаў – урэцка-налібоцкую.

Тэхнічная асаблівасць беларускіх шкляных вырабаў абумоўлена адвольным выдзіманнем [3, с. 22]. Пры такім спосабе вытворчасці посуду на вырабе застаецца незашліфаваны след ад понціі. Падобны адбітак не сустракаецца на заходне-еўрапейскіх вырабах, што робіць гэтую дэталь маркерам пры атрыбуцыі беларускага шкла.

Да асаблівасцей колеру ўрэцка-налібоцкага посуду можна аднесці ружова-фіялкавае, жаўтаватае, зеленаватае і дымчатае адценні «простага бясколернага» шкла. Каларыстычныя асаблівасці тлумачацца якасцямі мясцовага пяску, які быў насычаны жалезам. Акрамя «простага» шкла пачынаючы з XVIII ст. на мануфактурах Радзівілаў выраблялі і каляровае. Яно было даволі рэдкіх і прыгожых колераў: чырвонага, жоўтага, фіялетавага, зялёнага, сіняга і блакітнага [3, с. 46].

Яшчэ адной адметнасццю ўрэцка-налібоцкага посуду з’яўляецца яго дэкор. На думку даследчыцы М. Яніцкай, шматлікія вобразы ўрэцка-налібоцкага дэкору былі запазычаны з графікі беларускага кнігадрукавання, якое знаходзілася на даволі высокім узроўні ў гэты час. Такія высновы былі зроблены падчас параўнання дэкору шкляных вырабаў з гравюрамі беларускіх кніг, асабліва з гравюрамі Ф. Скарыны. Праяўленні заўважанага падабенства бачны ў шырокім выкарыстанні геральдычных сімвалаў, арабескавых і гратэскавых матывах, вазонах.

Урэцка-налібоцкія майстры ўспрынялі з беларускіх народных шкларобных традыцый не толькі форму, але і сродкі мастацкай выразнасці, каляровае рашэнне, гравіравальныя і рысавальныя матывы, што стварыла шэраг унікальных вырабаў, уласцівых толькі беларускім майстрам, якія і з’яўляюцца візітнай карткай беларускага шкла і сёння. Прыклады такога посуду – бутлікі для віна, якія выглядалі як паменшаныя бутэлькі, «карафінкі гладкія ў форме качак», «слоікі», «фляшы паўгарнцовыя», «чаркі», «жбанкі для кветак», дзіцячыя цацкі, флакончыкі. Асабліва багаты асартымент посуду, «запазычанага» з народнага гутнага шкла, быў характэрны Налібоцкай мануфактуры.

Цікавай і ўнікальнай з’явай Урэцкай і Налібоцкай мануфактур былі карафкі – нізкія графінчыкі квадратнай формы з вузкім і высокім горлам [4, с. 65]. Яны не мелі багатага аздаблення, толькі фасад гравіраваўся гербам [3, с. 53]. Значную частку асартымента мануфактур на працягу ўсяго XVIII ст. прадстаўлялі пуздэркі – дарожныя куфэркі, у якіх змяшчаліся розныя наборы посуду. Самыя папулярныя складаліся з карафкі і некалькі фляш [3, с. 67].

Яшчэ адной рысай мануфактур Налібак і Урэчча з’яўляецца вытворчасць пацешнага посуду, які прадстаўлены «дубельтамі» ці «блізнякамі». Дубельтовыя бакалы – гэта бакалы перахопленыя пасярэдзіне рэзкім звужэннем чаш. Такая форма бакалаў і кілішкаў падобна да беларускага спарыша. Спарыш – керамічны выраб у выглядзе двух спаяных гаршкоў, у якім насілі

абед на поле. Зразумела, што піць з такіх злучаных бакалаў прыходзілася адразу дваім, што было не вельмі зручна, але вельмі смешна. Функцыі такога посуду былі хутчэй пацешнымі, служылі арыгінальным прадметам дэкору [3, с. 53].

Таксама арыгінальнай урэцка-налібоцкай формай з'яўляюцца куляўкі – посуд без стапы. Паставіць такі бакал можна толькі перавярнуўшы яго чашай уніз, за што ён і атрымаў назву «куляўка». Такім чынам, такі бакал нельга паставіць на стол, не выпіўшы ўвесь напой. Куляўкі выраблялiся ў выглядзе рога, булавы, гарматы, мядзведзя. Вельмі часта куляўкі мелі розныя пацешныя надпісы, самым папулярным з якіх быў: «Згубіў нагу сваю, у вас абедзве адбяру» [3, с. 55].

У выніку, можна адзначыць, што ўрэцка-налібоцкае шкло істотна адрознівалася ад еўрапейскіх узораў, мела свае асаблівасці ў аздабленні, тэхніцы вытворчасці, формах вырабаў. Урэцка-налібоцкім вырабам уласцівы наступныя рысы: незашліфаваны след ад понціі на вырабах, невялікія адхіленні ад сіметрыі ў ножках бакалаў, мяккасць, пластычнасць сілуэту, каляровыя адценні «простага бясколернага» шкла, сувязь вобразаў дэкору з гравюрамі беларускага кнігадрукавання. Пад уплывам народных традыцый ва ўрэцка-налібоцкім шкларобстве сфарміраваліся ўласнабеларускія формы, да якіх адносяць карафкі, дубельты, куляўкі, пуздэркі, жбанкі для кветак і інш.

**Літаратура**


1. Скрыпчанка, Т. Налібоцкая шкляная мануфактура // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – 1999. – Т. 5. – С. 274.
2. Яніцкая, М. М. Урэцкая шкляная мануфактура // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. 1999. – Т. 6. – С. 590.
3. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVII стст.). Мінск : Навука і тэхніка, 1997.
4. Галоўка, С. Шкляныя цуды з Налібакаў // Беларуская думка. – 2016. – №10. – С. 60–67.


# Проблемы и перспективы развития отношений Беларуси и Европейского союза в рамках «Европейской политики соседства»


*Марченко Л. Е., магистрант БГУ*


Европейская политика соседства представляет собой комплекс политических, экономических, социальных, а также иных мер, направленный на расширение и углубление стран-членов ЕС со странами-соседями. Сюда входят 6 восточноевропейских и 10 средиземноморских стран. Также к це-